Источник: "Родная прырода" - №2, 2020-02-12

**Традыцыйна ў лютым праходзіць з'езд адной з самых масавых грамадскіх экалагічных арганізацый краіны грамадскага аб'яднання "Ахова птушак Бацькаўшчыны". АПБ у 2019 годзе — гэта больш за 1 900 сябраў, 700 валанцёраў і 14 мясцовых аддзяленняў. Разам усе гэтыя людзі (а магчыма, сярод іх і вы) дапамагаюць зберагаць беларускую прыроду.**




# Дапамога жывым каштоўнасцям

Як адзначыў дырэктар АПБ Аляксандр Вінчэўскі, летась аб'яднанне працавала ў самых розных прыродаахоўных напрамках. Гэта падрыхтоўка пашпартоў і ахоўных абавязацельстваў для чырванакніжных жывёл і раслін, работа па ахове і вывучэнні птушкі 2019 года вялікага арляца, праект па вывучэнні месцаў пражывання еўрапейскага вугра, расчыстка ад хмызняку і ўборка смецця на балотных комплексах краіны і многае іншае.

Усё гэта не атрымалася б зрабіць без людзей з розных куткоў краіны, адданых роднай прыродзе. Падчас з'езду многія з іх падымаліся на сцэну, каб атрымаць заслужаныя ўзнагароды. Так, штогод глабальная прыродаахоўная асацыяцыя BirdLife International ганаруе абаронцаў дзікай прыроды. У 2019 годзе ў Беларусі імі сталі вядомы рэжысёр-дакументаліст Ігар Бышнёў арнітолаг Дзяніс Кіцель і дырэктар Цэнтру экалагічнага выхавання і развіцця Руслан Шайкін. Дыпломы і памятныя падарункі атрымалі і пераможцы чэмпіянату па спартыўнай арніталогіі і двух апошніх чэмпіянатаў па фотабёрдынгу а таксама самыя актыўныя аддзяленні АПБ Брэсцкае, Слуцкае і Жыткавіцкае.

Цікавыя міні-лекцыі на прыродную тэматыку прадставілі сябры аб'яднання і госці з'езду Кандыдат біялагічных навук Мікалай Чэркас пазнаёміў з птушкай 2020 года па версіі АПБ глушцом. Вучоны з Вялікабрытаніі доктар Роб Філд адказаў на пытанні, як змяняецца клімат на планеце і чаму з тэрыторыі Беларусі могуць знікнуць шэры жураўель і глушэц. Беларускі навуковец Аляксандр Казулін расказаў пра транслакацыю птушанят вяртлявай чаротаўкі з заказніка "Званец" у літоўскі біясферны рэзерват "Жувінтас", якая з першага году прынесла добрыя вынікі. Батанік Дзмітрый Грумо патлумачыў, як на працягу стагоддзяў змянялася балота Дзікое, як на яго паўплывалі меліярацыя і спыненне кашэння, і інш.

Адбыліся і выбары "Птушкі года 2021" Сёлета прэтэндэнтаў на гэта званне не тры, як гэта было раней, а чатыры: звычайная туркаўка, звычайны ляляк, сініца-апалоўнік і стрынатка-чаротаўка. Вынікі галасавання стануць вядомыя бліжэй да канца года.

**Настасся АЛЯКСЕЕВА**
**Фота Андрэя КАТА**




## АПБ – 2019: ЛІЧБЫ І ФАКТЫ

- **У рамках праекту "Палессе дзікая прырода без межаў" GPS-перадатчыкамі пазначаны 9 вялікіх арляцоў, на гнёздах усталяваны 13 фотапастак. Атрыманы даныя пра памеры паляўнічых участкаў, міграцыйныя шляхі, месцы зімавання, феналогію гнездавання, харчаванне, выяўлены прычыны гібелі кладак і птушанят вялікага арляца. За перамяшчэннем 15 птушак можна сачыць на электроннай карце.**
- **Знойдзена новае месца пражывання вяртлявай чаротаўкі у рэспубліканскім біялагічным заказніку "Букчанскі"**
- **У рамках ініцыятывы "Хамяк, суслік і палятуха: выратаваць супергрызуноў!" у Беларусі знойдзены 8 калоній рабога сусліка і 80 месцаў пражывання палятухі, атрыманы 15 паведамленняў пра магчымыя месцы пражывання хамякоў, але пакуль не знайшлі ніводнай жылой нары. Падрыхтаваны больш за 70 пашпартоў і ахоўных абавязацельстваў для гэтых відаў.**
- **Прайшлі тры валанцёрскія летнікі ў рэспубліканскім заказніку "Ельня" Валанцёры адрамантавалі 6 перамычак у каналах і сабралі больш за 50 мяшкоў смецця.**
- **У супрацоўніцтве з Інстытутам эксперыментальнай батанікі і Водна-балотным цэнтрам АПБ лясной рабочай групай падрыхтаваны больш за 360 пашпартоў і ахоўныя абавязацельствы для больш чым 13 000 га рэдкіх і тыповых біятопаў.**



Настасся Аляксеева. Дапамога жывым каштоўнасцям